**УДК 94(476+474.5):328.1(476-89)(091)**

# СОЙМІКІ ПОЛАЦКАГА ВАЯВОДСТВА Ў ПАНАВАННЕ АЎГУСТА III

***канд. гіст. навук, дац. А.У. МАЦУК***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Даследуецца функцыянiраванне пасольскiх, грамнiчных, гаспадарскiх i элекцыйных соймiкаў Полацкага ваяводства ў панаванне Аўгуста III. З 14 полацкiх пасольскiх соймiкаў выбарам паслоў скончылiся 8 соймiкаў. Заўважана, што асаблiвасцю полацкiх пасольскiх соймiкаў было тое, што тут амаль выключна абiралiся пасламi толькi прадстаўнiкi мясцовай элiты. Па два разы полацкiмi пасламi абiралiся прадстаўнiкi родаў Шчытоў, Корсакаў Удзельскiх, Гласкаў, Буйнiцкiх, Рыпiньскiх. З 28 полацкiх грамнiчных соймiкаў выбарам дэпутатаў скончылiся 10 з iх. Выяўлена, што дэпутатамi абiралiся толькi прадстаўнiкi мясцовай элiты. Чатыры разы дэпутатамi абiралiся прадстаўнiкi роду Корсакаў Бабынiцкiх, два разы – Свалынскiх.*

**Уводзіны.** Праблема вывучэння соймікаў Полацкага ваяводства ў панаванне Аўгуста III знаходзілася па-за ўвагай айчынных і замежных даследчыкаў. Адрывістая інфармацыя пра функцыяніраванне полацкага сойміка ў панаванне Аўгуста III утрымліваецца толькі ў некаторых працах польскіх даследчыкаў Уладзіслава Канапчыньскага, Зафіі Зялінскай, Хенрыка Палькія, Марыі Чэпе [1 – 5].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца даследаванне соймікаў Полацкага ваяводства ў панаванне Аўгуста III. Разглядаецца перыяд ад канчатковага ўсталявання Аўгуста III на троне Рэчы Паспалітай у 1736 годзе і да яго смерці ў 1763 годзе.

У праўленне Аўгуста III у Полацку адбываліся наступныя віды соймікаў: пасольскія (перадсоймавыя), рэляцыйныя, дэпутацкія (грамнічныя), гаспадарчыя, элекцыйныя.

На пасольскім (перадсоймавым) сойміку адбываўся выбар паслоў на сойм Рэчы Паспалітай. Пасольскі соймік склікаўся каралеўскімі ўніверсаламі не пазней чым за 6 тыдняў перад соймам. "Нямы сойм" 1717 года вызначыў сталы тэрмін пачатку сойма на першы панядзелак пасля дня Святога Міхала (29 верасня) у цотныя гады. Пасольскія соймікі ў такім выпадку павінны былі склікацца ў другой палове жніўня.

Дэпутацкі (грамнічны) соймік, значэнне якога ў дадзены перыяд узрастае, збіраўся ў першы панядзелак пасля 2 лютага, свята Маці Божай Грамнічнай. Асноўнай мэтай яго правядзення былі выбары дэпутатаў Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Яшчэ адзін соймік гаспадарчы збіраўся назаўтра пасля грамнічнага. Часам гэта размежаванне адсутнічае і абодва соймікі выступаюць пад агульнай назвай ("грамнічны").

Выбары некаторых павятовых ураднікаў адбываліся на элекцыйных сойміках. На іх у Полацкім ваяводстве ў XVIII стагоддзі выбіралі ваяводу, падкаморыя, харужага, земскіх суддзю, падсудка і пісара. Права склікання элекцыйнага сойміка належыла ваяводу, акрамя выпадку склікання сойміка па выбару самога ваяводы, калі соймік склікаўся каралём.

Асноўную групу крыніц па вывучэнню соймікаў складаюць соймікавыя пастановы ("ляўдумы"), пратэстацыі супраць соймікаў і інструкцыі. Іншая справа, што падобных дакументаў Полацкага ваяводства панавання Аўгуста III захавалася вельмі нязначная колькасць. Значна папоўніць інфармацыю аб сойміках дазваляе карэспандэнцыя, якая ўтрымлівае шматлікую інфармацыю пра правядзенне і вынік соймікаў, якая знаходзіцца па-за ўвагай соймікавых дакументаў (інструкцыі, пастановы, пратэстацыі). Праўда, карэспандэнцыя носіць суб'ектыўны характар і інфармацыю з яе трэба правяраць іншымі відамі крыніц.

**Асноўная частка.** Пра першы полацкі грамнічны соймік 1736 года толькі вядома, што дэпутатамі на ім былі абраны полацкі гродскі суддзя Юзаф Падбіпента і вайпунскі староста Міхал Сяліцкі. Пасламі на полацкім пасольскім сойміку 1736 года былі абраны чашнік Вялікага княства Літоўскага Юзаф Шчыт і старадубскі падстароста Пётр Корсак Удзельскі. Дырэктарам сойміка быў абраны полацкі падсудак Юзафат Антоні Сялява. З ураднікаў на сойміку яшчэ прысутнічалі полацкі земскі суддзя Траян Гласко, полацкі земскі пісар Базылі Рыпіньскі, полацкі войскі Ян Корсак Удзельскі [4, s. 218; 6, арк. 11 – 12]. Напэўна ж тады, у 1736 годзе, але ўжо на рэляцыйным сойміку, у Полацку былі абраны камісары на Правіцыянальную камісію ВКЛ па павелічэнню войска полацкі земскі суддзя Траян Гласко і маркоўскі староста Ян Шчыт [7, s. 43]. На жаль нам не ўдалося знайсці дакументаў, якія адносяцца да гэтага сойміка. Нічога невядома і пра выбар полацкіх дэпутатаў у 1737 годзе. Можна меркаваць, што мясцовы грамнічны соймік быў сарваны.

Такі самы лёс напаткаў і полацкі грамнічны соймік 1738 года. Супраць яго быў занесены маніфест у аршанскія гродскія кнігі, згодна якому соймік адбыўся "на звычайным месцы на замку". Сарваны ён быў мясцовымі ўраднікамі, якія насуперак "шляхецкім галасам" сарвалі соймік. На наступны дзень прыватна сабраліся і пад дырэкцыяй полацкага войскага Яна Корсака Удзельскага абралі паслоў Юзафа Корсака і полацкага стражніка Эліяша Міхала Гласко да караля. На чале пратэставаўшай шляхты былі полацкі ротмістр Ігнат Корсак, вайпунскі староста Міхал Сяліцкі. Увогуле пратэстацыю падпісала 76 шляхціцаў [8, арк. 373 – 374].

У тым жа (1738) годзе пасламі ў Полацку пад дырэкцыяй вайпунскага старосты Міхала Сяліцкага былі абраны дудзскі староста Ян Буйніцкі[1] і Геранім Корсак Удзельскі [9, l. 236, 2362 – 2363]. Супраць іх выбару былі занесены пратэстацыі. Мясцовая шляхта на чале з полацкім земскім суддзёй Траянам Гласко сцвярджала, што полацкі войскі Ян Корсак Удзельскі, Пётр Корсак Удзельскі, чашнік ВКЛ Юзаф Шчыт і вайпунскі староста Міхал Сяліцкі на чале сваіх прыхільнікаў перашкаджалі распачаць пасяджэнні сойміка вышэйшаму мясцоваму ўрадніку полацкаму земскаму суддзе Траяну Гласко і не далі яму як камісару чыніць рэляцыю аб працы Правіцыянальнай камісіі ВКЛ па павелічэнню войска. Потым пагражаючы зброяй і не звяртаючы ўвагі на пратэстацыі, абралі дырэктарам Сяліцкага і паслоў на сойм Яна Буйніцкага і Геранім Корсака Удзельскага, а таксама паслоў па ўніверсал да караля на элекцыйны соймік па выбару полацкага ваяводы полацкага гараднічага Базылія Корсака Бабыніцкага і полацкага абознага Яна Войну. Пратэстацыя была падпісана 73 шляхціцамі на чале з інфлянцкім войскім Аляксандрам Гласко, Феліцыянам Корсакам, полацкім земскім суддзёй Траянам Глаской і крашуцкім старостай Юзафам Корсакам [9, l.759 – 760v, 2360 – 2361]. Апошні асобна пратэставаў супраць чашніка ВКЛ Юзафа Шчыта, які, пагражаючы пабіць Корсака, прымушаў таго падпісаць пустую паперу (напэўна, будучы крэдэнс паслам ці адмова ад пратэстацыі супраць іх выбару) [9, l. 2362 – 2363].

Полацкі грамнічны соймік 1739 года быў сарваны. Гаспадарчы соймік быў сарваны пасля выбару дырэктарам полацкага земскага суддзі Траяна Гласкі. Ініцыятарам зрыву была частка мясцовай шляхты: Корсакі, крашуцкі староста Ян Буйніцкі і вайпунскі староста Міхал Сяліцкі. Потым гэтыя ж шляхціцы сабраліся і абралі дырэктарам сойміка Марцэлія Байкоўскага і вызначылі паслоў да караля па ўніверсал на выбар полацкага ваяводы Пятра Корсака Удзельскага і Міхала Сяліцкага [10, арк. 594 – 595 адв.].

Дэпутатамі на сойміку 1740 года сталі Канстанцін Юзаф Свалынскі і крашуцкі староста Ян Буйніцкі. На жаль нам нічога невядома пра падрабязнасці гэтага сойміка. Таксама нам нічога невядома пра полацкіх паслоў у 1740 годзе. Можна меркаваць, што мясцовы пасольскі соймік быў сарваны. Магчымай прычынай быў канфлікт, які разгарнуўся падчас сойміка паміж полацкім стольнікам Юзафам Пакашам з Сяліцкімі і іх прыхільнікамі, якія нават атакавалі дом полацкага стольніка [11, арк. 367 – 368 адв.].

У 1741 годзе дэпутатамі былі абраны Антоні Нарніцкі і Ігнат Падвінскі [12, k. 4 – 5]. Акрамя таго, захаваўся дакумент, выдадзены з полацкага грамнічнага сойміка 1741 года полацкім бернардынам. З яго мы даведваемся, што дырэктарам сойміка быў рэчыцкі стольнік і полацкі ротмістр Траян Ласоўскі. З ураднікаў на сойміку былі прысутнымі полацкі земскі суддзя Траян Гласко, полацкі земскі пісар Базылі Рыпіньскі, полацкі войскі Ян Корсак Удзельскі, полацкі ротмістр Фабіян Корсак Бабыніцкі, полацкі мечнік Ануфры Буйніцкі, полацкі чашнік Ігнат Банавентура Рыпіньскі. Звяртае ўвагу, што адразу пасля земскага пісара свае подпісы паставілі Яўстах Храпавіцкі і смаленскі падстолі Феліцыян Грабніцкі, а ўжо толькі пасля іх полацкі войскі [6, арк. 1 – 2 адв.]. З ліста шунеліскага старосты Яўстаха Храпавіцкага да надворнага падскарбія ВКЛ Юзафа Францішка Сапегі становяцца вядомы некаторыя падрабязнасці сойміка. Былі прапанаваны тры кандыдаты на выбар дэпутатам: сам Храпавіцкі, Ігнат Падвінскі і Антоні Нарніцкі. Супраць кандыдатуры Храпавіцкага пратэставаў шляхціц Медунецкі, які меў прэтэнзію да шунеліскага старосты аб атрыманні прывілея на каралеўшчыну, якую трымаў як земскае ўладанне. Ініцыятарам пратэстацыі быў шляхецкі род Гласкаў на чале з мясцовым земскім суддзёй Траянам Гласкай. Незадаволены былі Гласкі і выбарам Падвінскага і Нарніцкага. Яны сфабрыкавалі пратэстацыю супраць сойміка, і пасля адмовы прыняць яе ў полацкім гродзе накіравалі яе актыкаваць у Віцебск [12, k. 4 – 5].

Полацкі грамнічны соймік 1742 года быў сарваны яшчэ да выбару дырэктара сойміка [13, k. 132; 14, p. 37v; 15, p. 612 – 612v]. З гэтага сойміка быў выдадзены "тэстымоніум ашмянскім патрыётам Юрыю і Яну Гушчам". З яго становіцца вядома, што соймік, як заўжды, адбываўся на замку [16, арк. 990 – 993 адв.].

У 1743 годзе дэпутатамі ў Полацку былі абраны полацкі ротмістр Фабіян Корсак Бабыніцкі і сітнянскі староста Юзаф Тадэвуш Рыпіньскі. З іх крэдэнсу вядома, што соймік адбыўся на замку. Дырэктарам сойміка быў абраны Людвік Корсак. З ураднікаў на сойміку былі прысутны полацкі земскі суддзя Траян Гласко, войскі Ян Корсак Удзельскі, ладаснянскі староста і полацкі ротмістр Геранім Корсак Удзельскі, полацкі стражнік Эліяш Міхал Гласко, полацкі гараднічы Базылі Корсак Бабыніцкі. Сярод падпісаўшай крэдэнс шляхты былі ў асноўным прадстаўнікі родаў Жукоў і Гласкаў. Падпісалі крэдэнсы і такія вядомыя ў будучым дзеячы ў Полацкім ваяводстве, як Канстанцін Юзаф Свалынскі і Ян Буйніцкі [17, арк. 1 – 4 адв.; 18, p. 5; 19, к. 1243].

На наступным полацкім грамнічным сойміку 1744 года дэпутатамі "без пратэстаў" былі абраны старадубскі гараднічы Ян Францішак Гласко і ладаснянскі староста Геранім Корсак Удзельскі. З крэдэнсу ім вядома, што соймік адбыўся "на звычайным месцы абрад на замку", а дырэктарам гэтага сойміка быў полацкі ротмістр Фабіян Корсак Бабыніцкі. З ураднікаў, акрамя яго, на сойміку прысутнічалі полацкі земскі суддзя Траян Гласко, полацкі войскі Сымон Корсак Удзельскі, полацкі гараднічы Базылі Корсак Бабыніцкі, полацкі будаўнічы Францішак Рыпіньскі, полацкі скарбнік Казімір Буйніцкі, полацкі стражнік Эліяш Міхал Гласко. Усяго свае подпісы пад крэдэнсам паставіла 166 шляхціцаў [20, арк. 71 – 71 адв.].

---

[1]Памылкова замест Яна Буйніцкага полацкім паслом называецца полацкі гродскі сурагатар і полацкі падчашы Антоні Буйніцкі [4, s. 224].

У гэты ж (1744) год у Полацку быў і пасольскі соймік. Пасламі былі абраны полацкі земскі суддзя Траян Гласко і маркоўскі староста Ян Шчыт. Захавалася інструкцыя паслам, з якой становіцца вядомым, што соймік адбыўся на "звычайным месцы абрадаў у замку". Дырэктарам сойміка быў полацкі войскі Сымон Корсак Удзельскі [20, арк. 841; 21, s. 294]. На жаль інструкцыя полацкім паслам не дае магчымасці даведацца аб іншых удзельніках гэтага сойміка.

Полацкі грамнічны соймік 1745 года быў сарваны. Больш пра гэты соймік нам нічога невядома. Няшмат вядома і пра элекцыйны соймік па выбару полацкага ваяводы, які адбыўся 21 лютага 1745 года. Гэты соймік таксама быў сарваны. Захавалася пратэстацыя супраць сойміка. Яна была падпісана пяццю шляхціцамі на чале з Тадэвушам Снарскім і полацкім ротмістрам Людвікам Корсакам шляхціцам [22, л. 1]. Невыключана, што існавалі і іншыя пратэстацыі супраць сойміка. Акрамя таго, падчас сойміка адбылася значная бойка ў двары полацкага падстолія і полацкага гродскага сурагатара Антонія Яна Корсака Залескага. Пабіты ў ёй аланскі староста Рэмігіян Корсак віну за бойку ўскладаў на полацкага канюшага Францішка Шчыта Забельскага [23, арк. 804 – 805 адв., 874 – 875 адв.].

У 1746 годзе на грамнічным сойміку дэпутатамі ў Полацку былі абраны інфлянцкі падчашы Андрэй Сакалоўскі і інфлянцкі скарбнік Ян Свалынскі. Соймік адбыўся на "звычайным месцы абрадаў нашых соймікаў". Дырэктарам сойміка быў абраны бецкі староста Ігнат Жук. Крэдэнс дэпутатам падпісалі мясцовыя ўраднікі: земскі суддзя Траян Гласко, войскі Сымон Корсак Удзельскі, стольнік Юзаф Пакаш, скарбнік Казімір Буйніцкі і мечнік Ануфры Буйніцкі. Усяго крэдэнс падпісала надзвычай вялікая колькасць полацкай шляхты (169 шляхціцаў). Сярод якіх больш усяго было прадстаўнікоў роду Гласкаў [19, к. 1424; 24, арк. 94 – 95 адв.]. Згодна лісту полацкага кашталяна Валяр'яна Жабы супраць выбару дэпутатаў не было пададзена ніводнай пратэстацыі [25, к. 193]. Ён памыляўся, бо ў аршанскія гродскія кнігі была занесена пратэстацыя супраць полацкага сойміка за подпісам трынаццаці шляхціцаў [26, арк. 128 – 128 адв.]. Сярод падпісаўшыхся не было ніводнага ўрадніка і пратэстацыя не перашкодзіла полацкім дэпутатам увайсці ў лік трыбунальскіх суддзяў на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ. На гэтым грамнічным сойміку полацкая шляхта прыняла яшчэ дакументы, якія датычыліся грашовых выдаткаў полацкім бернардынам і полацкім францішканам [24, арк. 92 – 93, 634 – 635 адв.]. У захаваўшымся "крэдэнсу полацкім бернардынам" сцвярджалася, што соймік адбыўся "на звычайным месцы" і былі абраны дырэктар і дэпутаты. Крэдэнс разам з дырэктарам бецкім старостай Ігнатам Жуком зураднікаў падпісалі толькі полацкі войскі Сымон Корсак Удзельскі, полацкі мечнік Ануфры Буйніцкі, полацкі ротмістр Марцэлі Байкоўскі і полацкі земскі і сурагатарскі рэгент Пётр Кулеша. Усяго свае подпісы пад крэдэнсам паставіла сямнаццаць шляхціцаў. Сярод падпісаўшыхся было некалькі Буйніцкіх: уплывовы мясцовы шляхціц, крашуцкі староста і трымальнік Полацкай эканоміі Ян, чэрніцкі староста Аляксандр і Іяхім [24, арк. 92 – 93]. У "крэдэнсу полацкім францішканам" сцвярджалася, што соймік адбыўся на "звычайным месцы абрад". Крэдэнс падпісала 25 шляхціцаў на чале з дырэктарам сойміка бецкім старостай Ігнатам Жуком, полацкім войскім Сымонам Корсакам Удзельскім, стольнікам Юзафам Пакашам. Яшчэ крэдэнс падпісалі мясцовыя ротмістры Марцэлі Байкоўскі і Фабіян Корсак Бабыніцкі [24, арк. 634 – 635 адв.]. Як бачым, колькасць і асобы падпісаўшых крэдэнсы бернардынам і францішканам значна адрозніваюцца. Гэтыя дакументы даюць інфармацыю толькі аб некаторых удзельніках сойміка.

На жаль нам нічога невядома аб полацкім пасольскім сойміку 1746 года, акрамя таго, што пасламі на ім былі абраны полацкі харужыц (згодна іншым звесткам харужы) Антоні Корсак (насамрэч полацкі падстолі і полацкі гродскі сурагатар Антоні Ян Корсак Залескі) і будаўнічы Францішак Мікалай Рыпіньскі [27, s. 239]. Вядома, што падчас сойміка адбыўся канфлікт паміж Фабіянам Корсакам Бабыніцкім і Сымонам Корсакам Удзельскім. Фабіян Корсак Бабыніцкі распачаў працэс супраць Сымона Корсака Удзельскага, які на пасольскім сойміку 1746 года не толькі не дапусціў Фабіяна заняць урад полацкага войскага, але і сам на сойміку незаконна заняў месца полацкага войскага і тытулаваўся ім. Гэта пры тым, што ў 1735 годзе ён саступіў гэты ўрад свайму сыну Яну Корсаку Удзельскаму, а пасля смерці таго прывілей на гэты ўрад атрымаў як раз Фабіян Корсак Бабыніцкі [24, арk. 686 – 687 адв.].

Няшмат вядома пра полацкі грамнічны соймік 1747 года. На ім з пратэстамі дэпутатамі былі абраны Снарскі і Байкоўскі. З выяўленай судовай справы становіцца вядомым, што падчас сойміка адбыўся канфлікт шляхціцаў Рэвута і Мяніцкага з полацкімі харужымі Корсакамі (Фабіян і Траян Корсакі Бабыніцкія). У пачаўшайся бойцы больш усіх быў паранены Рэвут [28, арк. 154 – 155 адв., 233 – 234 адв., 798 – 799 адв.]. У выніку на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ з-за існаваўшых пратэстаў, іх выбар быў прызнаны незаконным, а соймік – за сарваны [19, к. 1499]. Быў сарваны і полацкі грамнічны соймік 1748 года [19, к. 1578]. Пра іншы, пасольскі, соймік у тым годзе вядома толькі тое, што ён быў таксама сарваны [27, s. 304; 29, k. 122]. Полацкі грамнічны соймік 1749 года адбыўся, дэпутатамі на ім былі абраны Габрыэль Медунецкі і Антоні Тадэвуш Снарскі [19, k. 1652].

Паспяхова скончыўся і грамнічны соймік у наступным 1750 годзе. Дэпутатамі былі абраны полацкі гродскі сурагатар і полацкі ротмістр Траян Корсак Бабыніцкі і полацкі стальніковіч Антоні Вінцэнт Пакаш [19, k. 1711]. У віцебскія гродскія кнігі была пададзена пратэстацыя супраць іх выбару за

подпісам 25 шляхціцаў, якія сцвярджалі, што соймік у першы дзень быў сарваны. На другі дзень "пад прэтэкстам набажэнства спачатку прышоўшы да касцёла, а потым перайдзя да кляштара [францішканаў]" насуперак праву "не ў замку, у залі, не ў вызначаны час і прыватна" вызначылі дэпутатамі Корсака і Пакаша [30, арk. 63 – 64]. Пратэстацыя была занесена па ініцыятыве шляхецкага роду Снарскіх [31, k. 95]. Гэта пратэстацыя, аднак, не перашкодзіла полацкім дэпутатам на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ увайсці ў лік трыбунальскіх суддзяў. Вызначальным для гэтага аказаліся старанні падляшскага ваяводы Міхала Антонія і мсціслаўскага ваяводы Юрыя Феліцыяна Сапегаў, якія за допуск полацкіх дэпутатаў у лік трыбунальскіх суддзяў былі згодны дапусціць туды радзівілаўскіх прыхільнікаў навагрудскіх дэпутатаў [32, k. 321]. Паспяхова скончыўся і полацкі пасольскі соймік 1750 года. Пасламі былі абраны палкоўнік Юзаф Сасноўскі і полацкі стражнік Эліяш Міхал Гласко. Соймік адбыўся на "звычайным месцы пасяджэнняў". Дырэктарам сойміка быў абраны полацкі мечнік Ануфры Буйніцкі [33, арk. 516 – 251 адв.; 34, к. 256].

Полацкі грамнічны соймік 1751 года быў сарваны з-за значнай колькасці кандыдатаў на выбар дэпутатаў, якія не маглі прыйсці да згоды паміж сабой. У той жа час на гаспадарскім сойміку быў чытаны ліст падканцлера ВКЛ Міхала Чартарыйскага аб тым, што ён мае для полацкай шляхты каралеўскі ўніверсал на элекцыйны соймік на выбар полацкага ваяводы. Адначасова ў лісце Чартарыйскага ўтрымлівалася рэкамендацыя аб выбары полацкім ваяводай падляшскага ваяводы Міхала Антонія Сапегі. Ліст у сваю падтрымку да сойміка даслаў і сам Міхал Антоні Сапега. У выніку на сойміку былі абраны паслы па ўніверсалу на элекцыйны соймік Ян Храпавіцкі і сітнянскі староста Юзаф Тадэвуш Рыпіньскі [35, k. 52; 36, k. 1 – 2]. Мясцовая шляхта склала рэскрыпт на ліст Міхала Антонія Сапегі. Амаль уся шляхта "моцна запрашала" яго на ўрад полацкага ваяводы. Аднак супрацівы радзівілаўскіх прыхільнікаў вайпунскага старосты Міхала Сяліцкага і полацкага чашніка Юзафа Рэвута прымусілі змяніць тэкст на больш нейтральны "старацца аб братэрскія галасы" [36, k. 1 – 2].

Аб полацкім грамнічным сойміку 1752 года толькі вядома, што ён быў сарваны [37, l. 142 – 143]. Быў сарваны і полацкі пасольскі соймік 1752 года [2, s. 107; 38, s. 134].

У полацкіх гродскіх кнігах 21 лістапада 1752 года быў актыкаваны каралеўскі ўніверсал аб правядзенні ў Полацку 8 студзеня 1753 года элекцыйнага сойміка па выбару полацкага ваяводы [39, арk. 1181 – 1189; 40, k. 302]. Аб гэтым сойміку мы маем найбольшую колькасць інфармацыі з розных крыніц, згодна якім каля 9 гадзін раніцы шляхта сабралася на імшу да касцёла дамініканаў. Там узнік канфлікт паміж шляхтай – хто павінен быць абраным дырэктарам. Удалося прыйсці да згоды. Сам соймік распачаўся паміж 10 і 11 гадзінамі раніцы і працягваўся не больш за паўгадзіны. Прысутнічала вялікая колькасць шляхты (называецца завышаная лічба ў 4 – 5 тысяч шляхціцаў). Гэта прымусіла правесці соймік не ў "шопе" (павеце), а побач, на "пляцы замковым". Распачаў яго не вышэйшы прысутны ўраднік, а полацкі будаўнічы Францішак Рыпіньскі, што, напэўна, было ўзгоднена раней у дамініканаў. Пасля пачатку сойміка выступілі паслы ад караля – полацкі лоўчы Ян Храпавіцкі і сітнянскі староста Юзаф Тадэвуш Рыпіньскі, якія прывезлі каралеўскі ўніверсал на элекцыйны соймік па выбары полацкага ваяводы. Пасля быў абраны дырэктар сойміка, якім стаў Яўстах Храпавіцкі. Дырэктар сойміка выслухаў прапановы шляхты. Пераканаўся, што няма іншых прапаноў, акрамя выбару полацкім ваяводай Аляксандра Сапегі. Не аказалася і ніводнага нязгоднага з гэтай кандыдатурай, а шляхта крычала ў падтрымку Аляксандра Сапегі. Вайпунскі староста Міхал Сяліцкі і іншыя выступілі з віншаваннямі. Апошнім віншаваў дырэктар сойміка, які і скончыў яго пасяджэнні. Пасля чаго ўсе ўдзельнікі рушылі да езуіцкага касцёла [40, k. 302 – 303; 41, p. 182, 184 – 185].

Полацкі грамнічны соймік 1753 года быў сарваны з-за канкурэнцыі па выбары дэпутатамі Сіпайлы, Пжысецкага і Людвіка Корсака, якія не саступілі адзін аднаму [37, l. 254; 42, p. 147; 43, k. 152].

У 1754 годзе на полацкім грамнічным сойміку сітуацыя паўтарылася. Полацкая шляхта пагадзілася без супраціваў на выбар дэпутатам Свалынскага, а два іншых кандыдаты, Пжысецкі і Людвік Корсак, павінны былі вырашыць, хто з іх саступіць. Аднак не прыйшлі да згоды і соймік быў сарваны [37, l. 272; 44, p. 86 – 86v]. Такі самы лёс напаткаў і гаспадарскі соймік з-за пратэстаў шляхты супраць Францішка Зяновіча, які хацеў заняць месца на сойміку войскага (на які ўрад меў прывілей). Праўда, з гаспадарскага сойміка ўдалося накіраваць паслоў да караля з інфармацыяй аб выбары полацкім ваяводай Аляксандра Сапегі і просьбай выдаць яму прывілей на гэты ўрад [45, p. 10]. Пра полацкі пасольскі соймік 1754 года толькі вядома, што ён быў сарваны [38, s. 244]. Паспяхова скончыўся полацкі грамнічны соймік 1755 года, дэпутатамі на ім былі абраны полацкі скарбнік Людвік Корсак і Тадэвуш Пжысецкі [42, k. 25v; 45, p. 10; 46, p. 1; 47, k. 75].

Полацкі грамнічны соймік 1756 года быў сарваны з-за вялікай колькасці канкурэнтаў на абранне дэпутатамі. Вядома, што на сойміку прысутнічалі полацкі кашталян Канстанцін Людвік Плятэр, інфлянцкі кашталян Ян Шчыт і рэтаўскі староста Крыштаф Тышкевіч [19, k. 2047; 48, k. 21v]. Аб полацкім пасольскім сойміку маюцца розныя звесткі. Згодна лісту падскарбія ВКЛ Юрыя Флемінга, да першага саксонскага міністра Генрыха Бруля пасламі былі абраны Корсак і стальніковіч Рыпіньскі [49], а ў "Кур'еры Польскім" сцвярджалася аб зрыве сойміку [50]. Акрамя ліста Флемінга больш не маецца ніякіх звестак пра існаванне полацкіх паслоў у 1756 годзе. Магчыма, што полацкі пасольскі соймік 1756 года быў сарваны.

Таксама быў сарваны полацкі грамнічны соймік 1757 года [51, k. 28]. Дзякуючы захаванаму "крэдэнсу кармелітам бялыніцкага канвенту" ўдаецца даведацца, што на полацкім грамнічным сойміку 1757 года, які адбыўся на замку, быў абраны дырэктар – полацкі падстолі Канстанцін Юзаф Свалынскі, а зрыў сойміка адбыўся ўжо пры выбары дэпутатаў. Акрамя дырэктара сойміка гэты крэдэнс падпісалі мясцовыя ўраднікі: стольнік Ян Буйніцкі, падваявода Траян Корсак, гродскі суддзя Сымон Тадэвуш Пжысецкі, скарбнік Людвік Корсак. Свае подпісы яшчэ паставіла пяць шляхціцаў, з якіх трое прыналежылі да роду Корсакаў [52, арк. 286 – 287 адв.].

Аб наступным полацкім грамнічным сойміку 1758 года вядома, што ён быў сарваны яшчэ да выбару дырэктара сойміка [53, k. 107v; 54, k. 16]. Лепш была сітуацыя з пасольскім соймікам у гэтым годзе. Пасламі ў Полацку "на замку, на звычайным месцы абрадаў" былі абраны полацкі лоўчы Ігнат Корсак і прыхільнік Фаміліі – полацкі стольнік Ян Буйніцкі. Дырэктарам сойміка быў абраны полацкі земскі сурагатар Антоні Вінцэнт Пакаш [47, k. 269; 55, арк. 715 – 720 адв.; 56, k. 8; 57, l.1v; 58, c. 479]. На жаль захаваўшаяся інструкцыя паслам не дае магчымасць даведацца аб іншых удзельніках гэтага сойміка.

У 1759 годзе на грамнічным сойміку полацкая шляхта пагадзілася, каб дэпутатам быў абраны полацкі ротмістр Ігнат Есман, але з-за вялікай колькасці іншых канкурэнтаў на выбар яго калегі соймік быў сарваны [59, p. 5 – 5v; 60, k. 118]. У 1760 годзе на полацкім грамнічным сойміку з пратэстацыямі былі абраны дэпутаты – прыхільнікі Сапег Лянкевіч і Есман (напэўна полацкі ротмістр Ігнат Есман) [5, s. 213; 61, k. 162; 62, k. 62]. Ігнат Агінскі сцвярджаў, што крэдэнс Есману і Лянкевічу быў падпісаны на наступны дзень пасля сойміка. Мясцовая шляхта пратэставала супраць такіх дэпутатаў [61, k. 162]. Удалося выявіць пратэстацыю супраць сойміка ў віцебскіх гродскіх кнігах. Згодна яе, соймік адбыўся, як заўжды, на замку. Супраць сойміка пратэставалі полацкі войскі Францішак Зяновіч, яго сыны Антоні і Юзаф, полацкі ротмістр Стэфан Корсак, лідскі падстолі Ян Пажэцкі, полацкі скарбніковіч Юзаф Буйніцкі, Андрэй, Францішак, Якуб і Бенедыкт Кубліцкія, мальбаркскі падчашыц Юзаф Быліньскі. Пратэстацыя была выклікана тым, што было шмат кандыдатаў на выбар дырэктара сойміка і дэпутатаў, якія не маглі прыйсці да згоды. Частка ўраднікаў пры гэтым, не звяртаючы ўвагі на пратэстацыі, спрабавала любым спосабам абраць дырэктара сойміка і дэпутатаў. У выніку пратэставаўшая шляхта выступіла ў абарону вольнага голаса і выйшла з пратэстацыяй, якую не хацелі актыкоўваць у полацкім гродзе. На наступны дзень пагадзіліся актыкаваць пратэстацыю, але не хацелі ставіць дату калі соймік адбыўся (4 лютага 1760 г.), а хацелі ставіць днём актыкацыі (5 лютага 1760 г.). Гэта магло даць падставу прызнаць пратэстацыю няслушнай, бо яна была занесена не падчас сойміка. Гэта не задаволіла пратэставаўшую шляхту і яна для актыкацыі пратэстацыі накіравалася ў Віцебск [63, арк. 29 – 30 адв., 64, l. 790 – 791v]. Частка пратэставаўшай шляхты на чале з полацкім ротмістрам Янам і полацкім крайчыцам Тадэвушам Рыпіньскімі, Антоніям і Юзафам Зяновічамі, Бенедыктам Кубліцкім была гатова адмовіцца ад пратэстацыі і прызнаць легітымным выбар дырэктарам сойміка балдынеўскага старосты Фларыяна Рыпіньскага, калі дазволяць заняць месца войскага Антонію Зяновічу. Потым полацкі ротмістр Ян Рыпіньскі ўвогуле ад імя іншых адмовіўся ад пратэстацыі [65, арк. 296 – 297]. Такім чынам удалося супакоіць частку пратэставаўшай шляхты. Аднак пакрыўджаныя на Сапег Чартарыйскія і Агінскія на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ на падставе меўшыхся пратэстаў не дапусцілі полацкіх дэпутатаў у лік трыбунальскіх суддзяў.

У 1760 годзе пасламі на полацкім пасольскім сойміку былі абраны рэтаўскі староста Крыштаф Тышкевіч і балдынеўскі староста Фларыян Рыпіньскі [58, c. 538; 66, p. 96]. Соймік адбыўся на замку. Захавалася інструкцыя, дадзеная полацкім паслам і "тэстымоніум" шляхціцу Вінцэнту Хамскаму. З другога дакумента становіцца вядомым, што дырэктарам сойміка быў полацкі гродскі суддзя Сымон Тадэвуш Пжысецкі. Прычым раней яго гэты дакумент быў падпісаны полацкім паслом рэтаўскім старостай Крыштафам Тышкевічам, які не быў ніякім полацкім ураднікам. Звяртае ўвагу, што і пасля Пжысецкага свой подпіс пакінуў каралеўскі шамбелян Ігнат Жаба, а ўжо толькі пасля яго мясцовы ўраднік – полацкі падстолі Канстанцін Свалынскі. Яшчэ з ураднікаў свае подпісы падставілі полацкі падваявода Траян Корсак, полацкі гродскі пісар Станіслаў Грабніцкі і полацкі лоўчы Ігнат Корсак Бабыніцкі [65, арк. 895 – 898, 899 – 900 адв.].

Полацкі грамнічны соймік 1761 года быў сарваны з-за канкурэнцыі дэпутатаў з папярэдняга года Есмана і Лянкевіча, якіх у 1760 годзе не дапусцілі ў лік трыбунальскіх суддзяў на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ. Яны вырашылі зноў прэтэндаваць на выбар дэпутатамі, але сустрэлі супраціў радзівілаўскіх прыхільнікаў [67, к. 24]. У 1761 годзе полацкі пасольскі соймік быў сарваны шляхціцамі Зяновічамі па загаду Міхала Чартарыйскага [1, s. 207; 58, c. 558; 68, k. 327; 69, k. 391]. Прычым соймік адразу быў сарваны, і нават мясцовы вышэйшы ўраднік не здолеў пачаць яго пасяджэнні [70, k. 8]. Магчымай прычынай як раз і была барацьба вакол вышэйшага мясцовага земскага ўрада. У адсутнасць абіраемых земскіх ураднікаў (падкаморыя, харужага і земскага суддзі), такім ураднікам быў войскі. Гэты ўрад трымаў Антоні Зяновіч, якому дадзены ўрад у 1760 годзе перадаў бацька Францішак. Антоні Зяновіч сустрэў моцную апазіцыю з боку ўплывовага роду Корсакаў Бабыніцкіх. Корсакі Бабыніцкія не хацелі прызнаць перадачу ўрада

войскага Францішкам Зяновічам сыну Антонію і самі прэтэндавалі на яго. Яны не дапускалі Антонія Зяновіча заняць урад войскага на сойміку. Напэўна гэта і стала прычынай зрыву полацкага пасольскага сойміка 1761 года.

Аб вастрыні гэтай праблемы сведчыць факт, што перад наступным пасольскім соймікам полацкі ваявода Аляксандр Сапега для выбару паслом Мікалая Тадэвуша Лапацінскага бачыў толькі адзін шлях – прымусіць Корсакаў саступіць і даць Зяновічу заняць месца войскага на сойміку [71, 47v – 48]. У 1762 годзе пасламі былі абраны мсціслаўскі гродскі староста Мікалай Тадэвуш Лапацінскі і рэгент канцылярыі ВКЛ Міхал Сяліцкі [5, s. 213; 58, c. 571]. Можна меркаваць, што іх выбар адбыўся на паўторным сойміку, бо маецца інфармацыя аб зрыве першага пасольскага сойміка [71, р. 52; 72, k. 331]. Адбыўшыйся раней полацкі грамнічны соймік 1762 года, як і некалькі папярэдніх, быў сарваны. На жаль нам нічога невядома аб прычынах яго зрыву. Тым больш нечакана паспяхова скончыўся грамнічны соймік 1763 года. Дэпутатамі на ім былі абраны Гіляры Корсак і Сямон Тадэвуш Абрампальскі [5, s. 213].

Такім чынам, магчыма зрабіць наступныя **высновы.** Полацкія соймікі з 1736 па 1763 год, як і раней, адбываліся на замку. Толькі ў пратэстацыі супраць полацкіх дэпутатаў у 1750 годзе сцвярджаецца, што іх выбар адбыўся прыватна, у кляштары францішканаў. З 1736 па 1763 год адбылося 14 пасольскіх соймікаў і 28 грамнічных соймікаў. З 14 полацкіх пасольскіх соймікаў выбарам пасламі скончыліся 8 соймікаў. Адразу запар тры пасольскія соймікі (1752, 1754 і 1756 гг.) былі сарваны.

Аналіз спісу полацкіх паслоў сведчыць, што толькі адзін раз, у 1736 годзе, паслом быў абраны цэнтральны ўраднік ВКЛ – чашнік ВКЛ Юзаф Шчыт, які к таму ж прадстаўляў мясцовую эліту. Яшчэ адзін раз паслом у Полацку (1762 г.) быў абраны рэгент канцылярыі ВКЛ (супрацоўнік канцылярыі ВКЛ) Міхал Сяліцкі, які таксама прыналежыў да мясцовай эліты. Звяртае на сябе ўвагу і тое, што ў гэты час на полацкім пасольскім сойміку ні разу не быў абраны паслом хто-небудзь з маладых магнатаў Радзівілаў, Сапегаў, Агінскіх, Масальскіх і г.д. Гэта даволі часта адбывалася на іншых сойміках (віленскім, слонімскім, ашмянскім, гарадзенскім, ваўкавыскім і г.д.). Атрымліваецца, што на пасольскіх сойміках у Полацку абіраліся пасламі толькі прадстаўнікі мясцовай эліты. Па два разы полацкімі пасламі абіраліся прадстаўнікі родаў Шчытоў, Корсакаў Удзельскіх, Гласкаў, Буйніцкіх, Рыпіньскіх. Па аднаму – полацкімі пасламі абіраліся прадстаўнікі родаў Сасноўскіх, Лапацінскіх, Тышкевічаў, Сяліцкіх, Корсакаў Залескіх і Корсакаў Бабыніцкіх. Толькі адной асобе за гэты час удалося быць двойчы абранным паслом на полацкім сойміку. Гэта ўдалося Яну Буйніцкаму ў 1738 і 1758 гады.

Як бачна, у Полацкім ваяводстве не было ніводнага роду, які ў перыяд з 1736 па 1763 год мог правесці выбар пасламі сваіх прадстаўнікоў больш чым два разы. Шэсць разоў пасламі абіраліся мясцовыя ўраднікі. Прычым усе (земскі суддзя, стольнік, падстолі і гродскі сурагатар, лоўчы, стражнік, будаўнічы) абіраліся пасламі толькі па аднаму разу. Двойчы (1746 і 1758 гг.) пасламі абіраліся толькі полацкія ўраднікі. Двойчы пасламі абіраліся ўраднікі іншых паветаў і ваяводстваў (старадубскі ў 1736 г. і мсціслаўскі ў 1762 г.). Шэсць шляхціцаў увогуле не мелі ніякага ўраду (адзін з іх быў вайскоўцам). Аднойчы (1760 г.) абодва полацкія паслы былі шляхціцы без урадаў. Сярод вядомых асоб у ВКЛ, якія часта абіраліся пасламі на сойм, у Полацку абіраліся пасламі толькі Юзаф Сасноўскі (полацкі пасол 1750 г.) і Мікалай Тадэвуш Лапацінскі (полацкі пасол у 1762 г.).

З 28 полацкіх грамнічных соймікаў выбарам дэпутатаў скончыліся 12, але у двух выпадках (у 1747 і 1760 гг.) на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ выбар дэпутатаў быў прызнаны незаконным. З 1737 па 1739 год, з 1751 па 1754 год і з 1756 па 1762 год усе полацкія грамнічныя соймікі былі сарваны. Такім чынам, з 1736 па 1763 год выбарам пасламі скончылася 8 пасольскіх соймікаў, а законным выбарам дэпутатаў – 10 соймікаў. Сярод абіраемых дэпутатаў былі толькі прадстаўнікі мясцовай эліты. Найчасцей (4 разы) дэпутатамі абіраліся прадстаўнікі роду Корсакаў Бабыніцкіх. Два разы дэпутатам абіраліся прадстаўнікі роду Свалынскіх. Ніводны шляхціц у перыяд з 1736 па 1763 год не абіраўся дэпутатам двойчы. Па аднаму разу абіраліся дэпутатамі прадстаўнікі наступных родаў: Абрампальскіх, Буйніцкіх, Гласкаў, Корсакаў Удзельскіх, Медунецкіх, Нарніцкіх, Падбіпентаў, Падвінскіх, Пакашаў, Пжысецкіх, Рыпіньскіх, Сакалоўскіх, Снарскіх, Сяліцкіх. Пяць абраных дэпутатаў былі мясцовымі ўраднікамі: полацкі гродскі суддзя, полацкі гродскі сурагатар і полацкі ротмістр, полацкі скарбнік (2 разы), полацкі ротмістр. Двойчы дэпутатамі ў Полацку абіраліся ўраднікі іншых паветаў і ваяводстваў (старадубскі – 1744 г. і інфлянцкі – 1746 г.). Аналіз спісу паслоў і дэпутатаў прыводзіць да цікавых назіранняў, што толькі тры асобы ў Полацкім ваяводстве з 1736 па 1763 год абіралася як пасламі, так і дэпутатамі: Ян Буйніцкі (пасол 1738 і 1758 гг., дэпутат 1740 г.), Міхал Сяліцкі (пасол 1762 г., дэпутат 1736 г.), Геранім Корсак Удзельскі (пасол 1738 г., дэпутат 1744 г.). Такім чынам, пасламі і дэпутатамі на полацкіх сойміках з 1736 па 1763 год абіраліся амаль выключна прадстаўнікі мясцовай павятовай эліты.

З 1736 па 1755 год тройчы праводзіліся элекцыйныя соймікі па выбару полацкага ваяводы (1739 (ці 1740), 1745, 1753 гг.). Першыя два соймікі былі сарваны, і толькі апошняя спроба скончылася паспяхова, полацкім ваяводай быў абраны Аляксандр Сапега.

**Заключэнне.** З 1736 па 1763 год у Полацку адбылося 14 пасольскіх і 28 грамнічных соймікаў. З 14 полацкіх пасольскіх соймікаў выбарам пасламі скончыліся 8 соймікаў. На пасольскіх сойміках у Полацку амаль выключна абіраліся пасламі толькі прадстаўнікі мясцовай эліты. Па два разы полацкімі пасламі абіраліся прадстаўнікі родаў Шчытоў, Корсакаў Удзельскіх, Гласкаў, Буйніцкіх, Рыпіньскіх. Толькі Ян Буйніцкі двойчы быў абраны пасλом на полацкім сойміку ў 1738 і 1758 гадах. З 28 полацкіх грамнічных соймікаў выбарам дэпутатаў скончыліся 10. Сярод абіраемых дэпутатаў былі толькі прадстаўнікі мясцовай эліты. Чатыры разы дэпутатамі абіраліся прадстаўнікі роду Корсакаў Бабыніцкіх, два разы – Свалынскіх. Ніводны шляхціц у перыяд з 1736 па 1763 год не абіраўся дэпутатам двойчы.

Аналіз спісу паслоў і дэпутатаў сведчыць, што толькі тры асобы ў Полацкім ваяводстве з 1736 па 1763 год абіралася як пасламі, так і дэпутатамі: Ян Буйніцкі (пасол 1738 і 1758 гг., дэпутат 1740 г.); Міхал Сяліцкі (пасол 1762 г., дэпутат 1736 г.); Геранім Корсак Удзельскі (пасол 1738 г., дэпутат 1744 г.). Элекцыйныя соймікі па выбарах полацкага ваяводы ў 1739 (1740 г.) і 1745 гадах былі сарваны, і толькі ў 1753 годзе Аляксандр Сапега быў абраны полацкім ваяводай.

ЛІТАРАТУРА


1. Konopczyński, W. Polska w dobie wojny siedmioletniej / W. Konopczyński. – Warszawa, Kraków, 1909 – 1911. – T. 1 – 2.
2. Konopczyński, W. Sejm grodzieński 1752 r. / W. Konopczyński. – Lwów, 1907.
3. Zielińska, Z. Walka “Familii” o reforme Rzeczypospolitej, 1743 – 1752 / Z. Zielińska. – Warszawa, 1983.
4. Palkij, H. Sejmy 1736 i 1738 roku. U początków nowej sytuacji politycznej w Rzeczypospolitej / H. Palkij. – Kraków, 2000.
5. Czeppe, M. Kamaryla pana z Dukli. Kształtowanie się obozu politycznego Jerzego Augusta Mniszcha 1750 – 1763 / M. Czeppe. – Warszawa, 1998.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ у Мінску ). – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 29.
7. Palkij, H. Praca komisji aukcji wojska w latach 1736 – 1738 / H. Palkij // Kwartalnik Historyczny. – 1999. – Z. l. – S. 19 – 44.
8. НГАБ у Мінску. – Фонд 1731. – Воп. 1. – Спр. 21.
9. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. SA 95.
10. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 27.
11. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 28.
12. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Roski LII/7.
13. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Sygn. 638.
14. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 3091.
15. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 4061.
16. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 30.
17. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 31.
18. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 2203.
19. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. VI. – Sygn. 80a.
20. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 32.
21. Skibiński, M. Europa a Polska w dobie wojny o suksecje austriacką. T. 2 / M. Skibiński. – Kraków, 1913.
22. Львівська наукова бібліотека ім. В. Стефаника НАН України. – Фонд 103. – Воп. 1. – Спр. 6780.
23. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 33.
24. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 34.
25. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 18878.
26. НГАБ у Мінску. – Фонд 1731. – Воп. 1. – Спр. 30.
27. Diariusze sejmowe z wieku XVIII. T. 2. – Warszawa, 1912.
28. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 36.
29. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Ks. 8.
30. НГАБ у Мінску. – Фонд 1709. – Воп. 1. – Спр. 18.
31. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 17702, cz. 2.
32. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 39.
33. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Ks. 9.
34. Archiwum Państwowy, odział na Wawelu. Archiwum Młynowski Chodkiewiczów 1282.
35. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 2152.
36. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 13085.
37. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. – Op. 14. – B. 3.
38. Diariusze sejmowe z wieku XVIII. T. 3. – Warszawa, 1937.
39. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 41.

40. Biblioteka PAU PAN 361.
41. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 2554.
42. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 2559.
43. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 10.
44. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 2561.
45. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 443.
46. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 2206.
47. Biblioteka Czartoryskich 594.
48. Biblioteka Jagiellońska 6640.
49. Biblioteka Jagiellońska. Akcesja 24/61.
50. Kuryer Polski 1756, CLXV.
51. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 11914.
52. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 46.
53. Biblioteka Narodowa, BOZ 939.
54. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Sygn. 464.
55. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 47.
56. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. – Op. 2. – B. 101.
57. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 598. – B. 125.
58. Мацук, А. Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717 – 1763 гг.) / А. Мацук. – Мінск, 2010.
59. Lietuvos Mokslų Akademijos centrinės bibliotekos. – F. 139. – B. 4193.
60. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Ks. 16.
61. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 17702, cz. 4.
62. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 2147, cz. 3.
63. НГАБ у Мінску. – Фонд 1709. – Воп. 1. – Спр. 23.
64. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. SA 127.
65. НГАБ у Мінску. – Фонд 1734. – Воп. 1. – Спр. 49.
66. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. – Op. 14. – B. 14.
67. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 16680.
68. Biblioteka Czartoryskich 3843.
69. Archiwum Państwowy, odział na Wawelu. Archiwum Sanguszków 518.
70. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 2150.
71. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. – F. 1135. – Op. 14. – B. 23.
72. Biblioteka Czartoryskich 3851.

*Пастуліў 16.06.2011*

## SEJMIKS OF THE POLOTSK VOJVODESHIP IN THE REIGN OF AUGUST III

***A. MATSUK***

*In the reign of August III in Polotsk has taken place 14 envoy sejmiks (dietine, regional assemblies) and 28 deputational sejmiks (gromniczny). From 14 Polotsk envoy sejmiks in elections of envoys has terminated 8 sejmiks. At the envoy sejmiks in Polotsk representatives of local elite were almost exclusively selected. Twice as Polotsk envoys were elected representatives of the Shchytays, Korsakay Udelskys, Hlaskays, Bujnickys, Rypinskys. Only Jan Bujnicky has twice been elected on polotsk sejmik in 1738 and 1758 as envoy. From 28 polotsk deputational sejmiks 10 has terminated with choice of deputies. Among the deputies were enrolled only representatives of the local elite. Four times the deputies are elected representatives of the Korsakay Bobynickys, twice – Svolynskys. Not one nobles in the period from 1736 to 1763 was elected the deputy twice. The analysis of the list of envoys and deputies shows, that only three noblemen in the Polotsk Voivodeship (province) from 1736 to 1763 were elected both envoys, and deputies: Jan Bujnicky (the envoy in 1738 and 1758, the deputy in 1740), Michal Selicky (the envoy in 1762, the deputy in 1736), Geranim Korsak Udzelsky (the envoy in 1738, the deputy in 1744). Elektsionnye Sejmiks to elect voievoda of Polotsk in 1739 (1740) and 1745 were broken and only in 1753 Alexander Sapega was elected voievoda of Polotsk.*